РАБОЧИЙ

ЗАЦВЯРДЖАЮ

Дырэктар установы адукацыі «Міжнародны дзяржаўны экалагічны інстытут імя А.Д. Сахарава» Беларускага дзяржаўнага універсітэта

_______________С.А. Маскевіч

_______________2016 г.

13.02.2017 Б ПСП.3-2017

Палажэнне аб правядзенні
конкурсу творчых работ на беларускай мове
«СКАРБЫ РОДНАЙ МОВЫ»
ў МДЭІ імя А.Д. Сахарава БДУ

## I АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

1.1. Палажэнне вызначае парадак арганізацыі і правядзення конкурсу творчых работ на беларускай мове (далей – конкурс) у МДЭІ імя А.Д.Сахарава БДУ (далей – інстытут), яго арганізацыйна-метадычнае забеспячэнне, парадак удзелу і вызначэнне пераможцаў.

1.2. Конкурс творчых работ на беларускай мове – гэта праверка ведаў, уменняў і навыкаў, а таксама іх творчае прымяненне студэнтамі.

1.3. Мэта правядзення конкурсу:

– развіццё і ўдасканаленне ведаў і ўменняў;
– развіццё творчага патэнцыялу студэнтаў.

1.4. Задачы правядзення конкурсу:

1) умацаваць станоўчую матывацыю да карыстання беларускай мовай;
2) выявіць найбольш адораных студэнтаў;
3) выявіць узровень валодання беларускай мовай.

1.5. Удзельнікамі конкурсу з'яўляюцца студэнты 1-5 курсаў усіх спецыяльнасцей інстытута.

## II ПАРАДАК ПРАВЯДЗЕННЯ КОНКУРСУ

2.1 Конкурс творчых работ на беларускай мове праводзіцца кафедрай замежных моў (далей – кафедра) у адзін тур.

2.2 Заданні для конкурсу складаюцца выкладчыкамі кафедры і зацвярджаюцца на пасяджэнні кафедры.

2.3 У конкурсе прымаюць удзел усе зацікаўленыя студэнты інстытута, без абмежавання колькасці ўдзельнікаў.

2.4 Конкурс праводзіцца ў тэрмін з 01.03 бягучага года па 01.04 бягучага года.

2.5 За месяц да правядзення конкурсу кафедра размяшчае адпаведную аб'яву на сайце інстытута, у якой змяшчаецца заданне і патрабаванні для ўдзельнікаў конкурсу (Дадатак 1).

2.6 Падвядзенне вынікаў праводзіцца ў тэрмін з 01.04. бягучага года па 01.05 бягучага года.

2.7 Абвяшчэнне вынікаў конкурсу праводзіцца ў маі бягучага года.

## III ЖУРЫ КОНКУРСУ

3.1 Для правядзення конкурсу кафедрай фарміруецца журы з ліку яе выкладчыкаў. Склад журы конкурсу зацвярджаецца на пасяджэнні кафедры.

3.2 Журы конкурсу:

- ажыццяўляе сваю дзейнасць у адпаведнасці з дадзеным палажэннем;
- праводзіць праверку і ацэньвае работы;
- падводзіць вынікі конкурсу і ўзнагароджвае пераможцаў.

## IV КРЫТЭРЫІ АЦЭНКІ

4.1. Журы конкурсу ацэньвае работы, пададзеныя на конкурс па наступных крытэрыях культуры маўлення:

- правільнасць (захаванне носьбітамі мовы літаратурнай нормы);
- дакладнасць (адпаведнасць сэнсу слоў, выказванняў рэаліям, сітуацыям ці выкарыстанне пэўных слоў з пэўнымі, уласцівымі ім значэннямі);
- лагічнасць (лагічнае спалучэнне аднаго слова з іншым, каб яны не пярэчылі адно аднаму);
- чысціня (адсутнасць дыялектных слоў, прастамоўных слоў, жарганізмаў, плеаназмаў і таўталогіі, русізмаў);
- багацце (разнастайнасць выкарыстання моўных сродкаў);
- выразнасць (якасць ужывання моўных сродкаў).

## V СПРАВАВОДСТВА

5.1. Падчас правядзення конкурсу журы афармляе наступную дакументацыю:

- справаздачу аб выніках конкурсу.

5.2. Справаздача аб выніках конкурсу, праведзенага на кафедры, складаецца ў свабоднай форме і падаецца загадчыку кафедры не пазней за 10 дзён пасля заканчэння конкурсу.

## VI ПАДВЯДЗЕННЕ ВЫНІКАЎ І ЎЗНАГАРОДЖВАННЕ

6.1 Пераможцы конкурсу вызначаюцца па выніках конкурсу.

6.2. Журы рыхтуе выніковы пратакол конкурсу.

6.3. Рашэнне журы з'яўляецца канчатковым і не апелюецца.

6.5. Пераможцы конкурсу ўзнагароджваюцца каштоўнымі прызамі. Таксама могуць быць прапанаваны і іншыя формы заахвочвання пераможцаў, якія ўзгадняюцца ва ўстаноўленым парадку.

6.6. Узнагароджанне праводзіцца ў маі бягучага года пасля заканчэння конкурсу.

6.7. Інфармацыя аб выніках конкурсу размяшчаецца на сайце інстытута.

Разгледжана і зацверджана на пасяджэнні кафедры замежных моў 28.01.16, пратакол № 6.

Разгледжана і зацверджана на пасяджэнні Савета факультэта экалагічнай медыцыны 09.02.16, пратакол № 8.

Разгледжана і зацверджана на пасяджэнні Савета факультэта маніторынгу навакольнага асяроддзя 01.02.16, пратакол № 5.

Дадатак 1

## Асноўныя паняцці

Мастацкі пераклад – узнаўленне мастацкага твора ў рамках іншай моўнай культуры.

Эсэ – жанр філасофскай, літаратурна-крытычнай, публіцыстычнай і мастацкай літаратуры, сачыненне невялікага памеру, напісанае ў свабоднай, індывідуальна-аўтарскай манеры выкладання.

## Правілы афармлення работы

Тэкст набіраецца з дапамогай тэкставага рэдактара Microsoft Word. Для гэтага выкарыстоўваецца шрыфт Times New Roman памерам 14 пунктаў, выраўноўванне па шырыні. Палі: верхняе – 2 см, ніжняе – 2 см, левае – 3 см, правае – 1 см. Абзацны водступ – 1,25 см. Міжрадковы інтэрвал – паўтарачны.

Абъём работы – 2200-2500 друкаваных знакаў. Да перакладу дадаецца ўрывак з арыгінала.

## Афармленне тытульнай старонкі

Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт

Установа адукацыі
«Міжнародны дзяржаўны
экалагічны інстытут імя А.Д.Сахарава»
Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта
(МДЭІ імя А.Д.Сахарава БДУ)

Белорусский государственный университет

Учреждение образования
«Международный государственный
экологический институт имени А.Д.Сахарова»
Белорусского государственного университета
(МГЭИ им. А.Д.Сахарова БГУ)

Конкурс творчых работ на беларускай мове
«СКАРБЫ РОДНАЙ МОВЫ»

*Прозвішча, ініцыялы*

*Факультэт, курс, № групы*

*Назва работы*

г. Мінск